циалистами предприятий любых форм собственности в условиях противостояния, острой конкурентной борьбы и завоевания рынка.

Важнейшей формой активизации познавательной деятельности студентов является проблемное обучение.

Практическая реализация метода проблемного обучения по учетным дисциплинам может быть осуществлена в следующих формах организации учебного процесса: лекциях, семинарских и практических занятиях, самостоятельных исследованиях студентов и индивидуальной работе с ними.

Совершенствование лекционной работы в университете должно идти по трем основным направлениям: изучение содержания лекций, повышение методического мастерства преподавателей, совершенствование управления познавательной деятельностью студентов. Чтение лекций по методу проблемного обучения приобретает особую остроту.

Следует согласиться с мнением, что среди методических задач преподавания при этой форме обучения важнейшими являются:

формирование профессионального интереса к изучению учетных дисциплин;

создание педагогико-психологической основы сознательного и активного участия студентов при их изучении;

нахождение оптимального варианта, форм и методов организации и проведения учебных занятий с целью наилучшего закрепления знаний студентов;

применение более прогрессивных форм активизации самостоятельной работы студентов.

Необходимость решения проблемы побуждает студентов искать и сравнивать различные взгляды, самостоятельно находить пути к истине. Полученные таким образом знания становятся убеждением, так как студент сам активно участвует в учебном процессе. Обучение перестает быть только источником информации, а превращается в средство формирования теоретического мышления.

Такой подход в преподавании учетных дисциплин несомненно повысит качество подготовки специалистов высшей квалификации, будет способствовать расширению их навыков.

**В.М.Навумчык, А.А.Сакалова**
*(Беларускі дзяржаўны універсітэт)*

## Вучэбныя памылкі як сродак кіравання пазнавальнай дзейнасцю студэнтаў

Гістарычна склалася так, што ў педагогіцы вылучаюцца два падыходы. Адзін з іх імператыўны. Тэорыя і практыка гэтага напрамку зыходзяць з таго, што без прымусу нельга дабіцца добрых вынікаў у навучанні і выхаванні. Другі падыход — непрымусовы, у аснове якога непаўторнасць асобы, яе самакаштоўнасць і унікальнасць. Разгледзім з боку непрымусовасці адзін з парадоксаў сучас-

най сярэдняй і вышэйшай школы — адносіны да студэнцкіх (вучнёўскіх) памылак.

Памылка — гэта асноўны аргумент для паніжэння адзнакі, для папрокаў і "аргвысноў". Студэнт, які зрабіў памылку, прайграе перад студэнтам, які такой памылкі не дапусціў. У гэтым бачыцца крыніца магчымай палярызацыі адносін у вучэбнай студэнцкай групе. Памылка і адэкватная ёй адзнака вызначаюць сацыяльны статус студэнта і памер яго аўтарытэтнасці ў групе.

Паспрабуем па-іншаму аднесціся да феномену памылак. На кожным занятку настаўнік павінен пераканацца, што аўдыторыя яго разумее, матэрыял дастаткова добра засвоены. Якім чынам? Можна, канешне, спытаць, ці ўсім усе зразумела. Але ж у такім выпадку настаўнік атрымае недакладную інфармацыю, бо гэта пытанне рытарычнае. Калі такі спосаб не працуе, застаюцца кантрольныя практыкаванні. Тут высвятляецца, што значная частка групы не засвоіла матэрыял, не зразумела галоўнага, не вылучае блізкіх па сэнсу паняццяў і г.д. Усё гэта ёсць крыніца памылак.

Як павінен рэагаваць настаўнік на памылкі? На нашу думку, ён *павінен быць удзячным студэнтам за тое, што яны дапамаглі яму ў яго працы*. Яны аператыўна і дакладна падказалі настаўніку, на што неабходна звярнуць увагу, як метадычна аптымальна пабудаваць вучэбны працэс. Студэнты выступілі як сааўтары ўрока, як памочнікі настаўніка. Вось дзе крыюцца вытокі педагогікі супрацоўніцтва ў вну.

Прычынай памылак могуць аказацца і тыя ж асацыяцыі, якія ўзнікаюць на падставе мінулага вопыту кожнага чалавека і носяць індывідуальны характар. У гэтым выпадку настаўніку неабходна сфарміраваць падмурак прадмета, зрабіць яго зразумелым кожнаму слухачу і на гэтай падставе развіваць сваіх выхаванцаў.

Асацыятыўная прырода памылак праяўляецца часам у тым, што калі два паняцці для чалавека блізкія, то ён можа іх выкарыстоўваць з роўнай імавернасцю, замяняючы адно паняцце другім. Яшчэ Я.А.Каменскі адзначаў: "Усё, што трэба адрозніваць адно ад другога, павінна быць адрознена" (*Коменский Ян Амос*. Избранные педагогические сочинения. Т.1. Великая дидактика. М., 1939. С. 318.). Калі паняцці, якія для чалавека прадстаўляюцца падобнымі, адначасова з'яўляюцца і аб'ектыўна падобныя, то можа быць невялікая замена паняццяў, памылкі ніякай няма. Аднак калі паняцці аб'ектыўна розныя, то іх атаясамленне — гэта ўжо памылка.

Але ж калі не звяртаць на гэта увагі, то здаецца, што памылкі вучняў ці студэнтаў перашкаджаюць руху ўперад. Ад памылак трэба пазбаўляцца. І замест падзякі студэнтам — педагагічныя рэпрэсіі. Папрокі позіркам, словам, адносінамі да студэнта, які зрабіў памылку. Дарэчы, гэтую асаблівасць адзначаў яшчэ Рабіндранат Тагор, які пісаў: "Перад памылкамі мы зачыняем дзверы. У замяшанні ісціна: "Як мне ўвайсці цяпер?"

Памылкі характэрны не толькі ў школе ці ў вну. Чалавек вучыцца ўсё сваё свядомае жыццё і, як ні дзіўным гэта здаецца, усё жыццё дапускае памылкі. У ідэале з цягам часу памылак павінна быць усё меней і меней, хоць практыка адзначае, што гэта не

заўсёды так. Тым не менш памылкі выяўляюць супярэчнасці, якія даюць магчымасць чалавеку развівацца, тварыць, ісці наперад.

Толькі практыка, аналіз асабістых поспехаў і няўдач дазваляе вырвацца чалавеку на новыя рубяжы навукі, тэхнікі, сацыяльнага прагрэсу. Уменне аналізаваць і рабіць высновы з аналізу — унікальная якасць творчай асобы. Гэтую думку выказаў яшчэ ў 1941 г. П.Л.Капіца: "Мы яшчэ лічымся з памылковым самалюбствам, заснаваным на няправільным уяўленні, быццам сталы вучоны не можа памыляцца, бо "памылка" павінна яго дыскрэдытаваць. Мы быццам забываем, што толькі той не памыляецца, хто нічога не робіць. Але ж уся навуковая ісціна сённяшняга дня можа быць заўтра дапоўнена ці зменена, бо мы знаходзімся ў стане бесперапыннага набліжэння да пазнання сапраўднай прыроды рэчаў. Толькі пераадольваючы памылку за памылкай, мы атрымліваем усё болей блізкае рашэнне пастаўленай праблемы. Памылкі не ёсць яшчэ несапраўдная навука. Несапраўдная навука — гэта непрызнанне памылак. Толькі таму яна — тормаз для здаровага навуковага развіцця" (*Капица П.Л.* Эксперимент, теория, практика. М., 1977. С.125.).

**Ю.В.Лешкович,** *доцент*
*(Белорусский государственный экономический университет)*

## Рейтинговый контроль как средство активизации познавательной деятельности студентов

Проблема активизации познавательной деятельности студентов является весьма актуальной, особенно на 1 — 2 курсах. Это связано с отсутствием навыков регулярной самостоятельной работы, ограниченностью фонда учебной литературы и пр. Очевидно, здесь сказывается и психологический момент: переход от жестко регламентированной школьной системы обучения к более демократичной — вузовской, "расхолаживающей" студентов.

Очевидно, что решению этих проблем во многом может способствовать применение рейтинговой формы контроля. Ее достоинство не только в регулярности, охвате большинства видов учебной работы, но и в том, что она вызывает у студентов стремление занять лидирующее положение в группе. А это возможно только при глубоком знании предмета.

Нами при проведении семинарско-практических занятий по курсу "Размещение производительных сил" оценивались следующие показатели:

1) ответ студента — по 5-балльной шкале;

2) активность на занятии (участие в обсуждении, дополнение) — от 1 до 3 баллов;

3) практическая работа (срок выполнения, качество, глубина выводов) — от 1 до 3 баллов;

4) реферат — от 3 до 5 баллов;